Сёння, калі мы разважаем аб адраджэнні беларускай культуры, перш за ўсё думаем аб народнай творчасці, аб пашырэнні яе ролі ў нашым жыцці.

І не выпадкова ў крытычныя моманты ў развіцці нашай культуры мы звяртаемся да фальклору і яго традыцыі. Раней фальклор з'яўляўся важным сродкам духоўнага развіцця народа. Для большасці ён быў фактычна школай і кнігай. Фальклорныя творы перадаюць багаты жыццёвы вопыт народа, яго мудрыя думкі, фарміруюць эстэтычныя і мастацкія густы. Традыцыйныя радзінныя звычаі і абрады беларусаў у канцы 19—пачатку 20 стагоддзя ўяўлялі сабой стройную сістэму, у якой знайшлі адлюстраванне разнастайныя бакі народнай культуры, побыту, філасофіі, рэлігіі, светаўспрымання і светаасэнсавання. Адначасова яны з'яўляліся складанай часткай духоўнай культуры і народнага побыту.

Улічваючы ўсё гэта, на нашу думку, будзе вялікай памылкай не выкарыстоўваць вялікага патэнцыялу тых галін культуры, дзе ёсць непасрэдны кантакт з традыцыйнай народнай творчасцю.

**Гаранец І.М.,**
*аспірантка кафедры*
*рэжысуры свят*

## СВЯТА ЯК АБ'ЕКТ САЦЫЯКУЛЬТУРНАГА АНАЛІЗУ

Культура — з'ява вельмі складаная і разнастайная. Большасць тэарэтыкаў, вызначаючы паняцце "культура", прызнаюць непасрэдную сувязь культуры з прадметна-пераўтваральнай дзейнасцю чалавека. Э.С.Маркаран у кнізе "Тэорыя культуры і сучасная навука" піша: "Узніклая на досвітку чалавечай гісторыі ў якасці спецыфічнага сацыяльнага феномена, унікальнага механізму самазахавання

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

грамадства, культура і зараз працягвае выконваць гэтую функцыю, несучы ў сабе даволі магутны зарад на перспектыву" (М.: Мысль, 1983.— С.23). Культура пранізвае ўсе сферы жыцця грамадства, і на яе глабальных характарыстыках мы спыняцца не будзем. Мы абмяжуемся спецыяльным падыходам да гэтай з'явы. У першую чаргу нас цікавіць яе аб'ектыўны характар.

Адзін з першых прадстаўнікоў сістэматызацыі агульнай тэорыі культуры, амерыканскі культантраполаг Лэслі Уайт (1900—1975) назваў сваю тэорыю культуралогіяй, вызначыў паняцце "культура" як навуковую катэгорыю, што выражае асаблівую сферу рэчаіснасці, уласцівую толькі чалавечаму грамадству і маючую свае ўласныя законы функцыяніравання і развіцця. Ён падзяляе культуру як цэласную сістэму на тры галоўныя арганізаваныя падсістэмы:

1) тэхналагічную, яна складаецца з матэрыяльна выражаных інструментаў і тэхнікі іх выкарыстання, пры дапамозе якіх чалавек ажыццяўляе ўзаемадзеянне з прыродным асяроддзем;

2) сацыяльную, уключае ўзаемаадносіны паміж людзьмі;

3) ідэалагічную, яе складаюць ідэі, вераванні, веды.

Апошняя падсістэма ўключае таксама міфалогію, рэлігію, літаратуру, народную мудрасць.

Безумоўна, што ў культуры як цэласнай сістэме яе падсістэмам уласцівы складаныя ўнутраныя і знешнія сувязі. Задачу вызначэння і сістэматызацыі гэтых сувязей паставіў перад сабою М.С.Каган у кнізе "Чалавечая дзейнасць". Аўтар, прымаючы азначэнне культуры як пазабіялагічна выпрацаванага, асаблівага, толькі чалавеку ўласцівага спосабу дзейнасці, прапануе вылучыць у ёй перш-наперш тэхніка-тэхналагічную і прадметна-прадукцыйную грані, а таксама тры пласты: матэрыяльную, духоўную і мастацкую культуру.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Унутраная будова духоўнай культуры ў адрозненне ад матэрыяльнай, у якую ўваходзяць прадукты толькі двух відаў чалавечай дзейнасці — пераўтваральнай і камунікатыўнай, уключае таксама прадукты пазнавальнай і каштоўнасна-арыентаванай дзейнасці. Вылучэнне ж мастацкай культуры М.С.Каган абгрунтоўвае тым, што мастацтва валодае унікальнай культурагеннай здольнасцю ўтвараць вакол сябе адносна аўтаномную сферу ўсіх спецыяльна на яго арыентаваных відаў чалавечай дзейнасці (пераўтваральнай, пазнавальнай, камунікатыўнай і каштоўнасна арыентаванай).

Паспрабуем разабрацца, як суадносяцца паняцці "культура" і "свята". Не выклікае сумнення, што свята існуе ў "целе" культуры як самастойная катэгорыя і суправаджае ўсе гістарычна-часавыя фазы культуры. У архаічнай, міфапаэтычнай і рэлігійнай традыцыях свята — гэта "часавы адрэзак, які валодае адметнай сувяззю са сферай сакральнага ... і адзначаны як нейкае інстытуцыялізаванае (нават калі яно мае імправізацыйны характар) дзейства" (гл.: Мифы народов мира: Энциклопедия: В 2 т. См.: Т.2.– С.329). Па вобразным выказванні М.М.Бахціна, "свята — гэта вельмі важная першасная форма культуры. Яе нельга вывесці з практычных умоў і мэтаў грамадскай працы або з біялагічнай (фізіялагічнай) патрэбы ў перыядычным адпачынку. Свята заўсёды мела істотны і глыбока сэнсавы светасузіральны змест".

Ніякае "практыкаванне" ў арганізацыі і ўдасканаленні грамадска-працоўнага працэсу, ніякая "гульня ў працу" і ніякі адпачынак або перапынак у працы самі па сабе ніколі не могуць стаць святочнымі. Дзеля таго, каб яны сталі святочнымі, да іх павінна далучыцца штосьці з іншай сферы быцця. Яны павінны атрымаць санкцыю не са свету сродкаў і неабходных умоў, а са свету вышэйшых мэт чалавечага існавання, г. зн. са свету "ідэалаў" (гл.: Бахтин М.М. Творчество Франсуа Рабле и народная

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

культура средневековья и Ренессанса. М., 1965.— С.13–14).

У генезісе свята можна вылучыць дзве найбольш істотныя прыметы. Па-першае, гэта проціпастаўленне будзённым дням. Свята — гэта заўсёды іншае светаадчуванне, іншы раз не агульнапрынятыя, а процілеглыя каштоўнасці (напрыклад, "каралём" свята можа быць вясковы блазан). Іншымі словамі, свята — гэта нейкі паралельны свет, мікракосм, які жыве па адметных, іншых, чым будні, законах. Характэрны ў гэтым сэнсе рымскі каляндар свят, дзе пазначаліся святочныя дні, гульні, дні ахвярапрынашэння, адзначаемыя гістарычныя падзеі. Гэты каляндар (лац. festi), "які вёўся пантыфікамі і быў больш або менш закрыты" да 305 г. да н.э., адначасова ўяўляў сабой і аналы, і гістарычную хроніку. Рымляне дзялілі гэтыя дні на diesfesti, г. зн. дні, прысвечаныя служэнню багам, і diesprofesti, калі займаліся звычайнымі грамадскімі і прыватнымі справамі.

Другой істотнай прыметай свята можна лічыць яго сакральнасць. Любое свята гістарычна суаднесена з сакральнымі каштоўнасцямі пэўнай суполкі, яе сакральнай гісторыяй або якой-небудзь іншай падзеяй, якую соцыум лічыць сакральнай. Гэтыя сувязі ў гісторыка-часавым кантэксце добра назіраюцца нават тады, калі падзея траціць свой статус, але мае працяг у якасці святочнага рытуалу, эпізоду. Працяг можа быць у дзіцячай гульні ў змененым, іншы раз прафанаваным выглядзе, але падзея не страчвае сваёй сакральнай сутнасці, г.зн. транслірые сакральную каштоўнасць у часе.

Семантычныя значэнні свята так ці інакш сцвярджаюць ідэю сакральнасці. Параўнаем беларускае "свята", польскае "swieto", сербскае "свечаник", англійскае "holiday" (holi — святы). Характэрны таксама абазначэнні нядзелі як сонечнага або Божага дня: нямецкае "Sonntag", англійскае "sunday"; абазначэнне незанятасці працай: беларускае "нядзеля"; украінскае "неділя", рускае "праздник".

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Тэзіс аб тым, што ў гісторыка-часавым кантэксце свята суаднесена з сакральнымі каштоўнасцямі суполкі, патрабуе асобнага разгляду, таму што тут, як нам здаецца, мы знойдзем ключ да разумення суадносін паняццяў "культура" і "свята". На нашу думку, сакральныя каштоўнасці грамадства і каштоўнасці асэнсаваныя, сфармуляваныя ў свяце, адрозніваюцца паміж сабой. Сутнасць у тым, што ў свяце каштоўнасці асэнсоўваюцца на высокім творчым узроўні. Свята быццам згушчае рэальнасць, заключаючы ў сабе ў канцэнтраваным выглядзе ўсё лепшае, што выбірае для яго (свята) суполка. Паўтараючыся шмат разоў, творча асэнсаванае, апаэтызаванае "лепшае" акумулюецца ў свяце і складваецца ў культурную традыцыю, якая звязвае культуру і свята. Значыць, свята па сваёй сутнасці ёсць культурная традыцыя? Паспрабуем разгледзець гэтае пытанне.

Традыцыя — перадача (лац. tradere — перадаваць, уручаць). Паняцце "культурная традыцыя" шырока трактуецца ў літаратуры, прычым даволі часта з супрацьлеглых пазіцый. У асноўным характэрны два падыходы да разумення прыроды традыцыі. І.В.Суханаў лічыць, што традыцыя і звычай не тоесныя паняцці. Традыцыі (у адрозненне ад звычаяў, якія фарміруюць грамадскія адносіны шляхам дэталёвых прадпісанняў на той або іншай падставе) звернуты да духоўнага свету чалавека і выконваюць сваю ролю сродкаў стабілізацыі і ўзнаўлення грамадскіх адносін не непасрэдна, а праз фарміраванне духоўных якасцей (гл.: Суханов И.В. Обычай, традиции и преемственность поколений. М., 1976.— С.25). Гэты ж аўтар зазначае, што традыцыі (як звычаі і рытуалы) не могуць быць юрыдычна рэгламентаванымі паняццямі. Гэта "ўстанаўленні", што падтрымліваюцца толькі сілай грамадскай думкі. Д.М.Угрыновіч, у адрозненне ад І.В.Суханава, піша аб атрыманні культуры ў спадчыну. Галоўнай яе асаблівасцю з'яўляецца сам механізм узнаўлення чалавечай дзейнасці. Вопыт чалавечай

дзейнасці новыя пакаленні набывалі не шляхам засваення прынцыпаў або нормаў гэтай дзейнасці, а шляхам капіравання, узнаўлення цэлых яе адрэзкаў, “кавалкаў” ва ўсіх дэталях і падрабязнасцях (гл.: Угринович Д.М. Обряды. За и против. М., 1975.— С.15—16). На думку Ю.Брамлея, “традыцыі — гэта толькі тыя ўстойлівыя з`явы грамадскага жыцця, трансмісія і акумуляцыя якіх з‘яўляюцца даменам грамадскай свядомасці” (Бромлей Ю.В. Этнос и этнография. М., 1973.— С.69).

Прывядзём яшчэ некалькі розных фармуліровак паняццяў “традыцыя” і “звычай” у розных аўтараў. “Традыцыі — устойлівыя з’явы грамадскай свядомасці, якія выяўляюцца ў норавах, звычаях, навыках, метадах і формах вытворчай працы, у вызначаным характары ўзаемаадносін паміж людзьмі, у поглядах, ладзе жыцця, паводзінах, з’явах культуры, светапоглядах, маралі і г.д.”,— піша Я.Л.Храпінскі (Храпинский Я.Л. Нравственность и традиции: Учеб. пособие. М., 1971.— С.48). В.А.Малінін гаворыць аб “спосабе выяўлення істотных з’яў, характэрных для прагрэсіўнага развіцця формаў грамадскай свядомасці, якія фіксуюць у традыцыі гістарычныя этапы і асаблівасці свайго існавання”. Падзяляючы ў той ці іншай ступені прыведзеныя думкі, якія тычацца паняццяў “традыцыя”, “культурная традыцыя”, хочацца зазначыць, што намі больш, чым іншыя, прымальныя думкі Э.С.Маркарана, выкладзеныя ім у кнізе “Тэорыя культуры і сучасная навука”: “Культурная традыцыя — гэта выяўлены ў сацыяльна арганізаваных стэрэатыпах групавы вопыт, які шляхам прасторава-часавай перадачы акумуліруецца і ўзнаўляецца ў розных чалавечых калектывах” (М., 1983.— С.154). Далей аўтар адзначае: “Культурная традыцыя звычайна супрацьпастаўляецца творчаму пачатку актыўнасці людзей. Такое проціпастаўленне цалкам апраўдана, калі разглядаць гэтыя з‘явы ў статыцы. Але калі падыходзіць да вывучэння традыцый з пункту гледжання развіцця, дынамікі, у гэтым

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выпадку жорсткае супастаўленне аказваецца неправавмерным, таму што любая інавацыя, калі яна прымаецца мноствам уваходзячых у яе або іншую групу людзей, стэрэатыпізуецца і ператвараецца ў традыцыю. Таму дынаміка культурнай традыцыі — гэта пастаянны працэс пераадолення адных відаў сацыяльна арганізаваных стэрэатыпаў і ўтварэння новых. Святочная традыцыя, як мы ўжо гаварылі вышэй, гэта не проста перадача стэрэатыпаў, гэта перадача апаэтызаваных сакральных каштоўнасцей, не проста перадача прылад працы і працоўных прыёмаў, а перадача апаэтызаваных, творча асэнсаваных, духоўна неабходных дзеянняў. Трэба зазначыць, што свята — гэта не набор культурных традыцый, звычаяў і абрадаў. Свята — гэта яшчэ і ландшафт, культурная прастора, атмасфера, пэўны адрэзак часу, сфарміраваны соцыум па той ці іншай прымеце (нацыянальнасць, узрост, пол і інш.). Усе гэтыя элементы і вызначаюць сутнасць свята. На нашу думку, свята — гэта асаблівы спосаб камунікацыі, перадача апаэтызаванага творчага вопыту, складаны і поліфункцыянальны сацыякультурны феномен. Культура як усеабдымная катэгорыя ўключае свята, якое, акумулюючы апаэтызаваныя культурныя каштоўнасці, традыцыі, навацыі, абрады і звычаі, з'ўляецца сувязной ніткай, транслюючы назапашаныя пастаянныя і відазменныя культурныя творча асэнсаваныя каштоўнасці. Інакш кажучы, мы можам назваць свята музеем традыцый, у якім захоўваюцца і дэманструюцца жамчужыны святочнай творчасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ